# Каля тысячы беларусаў здалі кроў у Сусветны дзень донара

## Сярод іх — кіраўніцтва міністэрстваў, дэпутаты, медыйныя асобы



**У Сусветны дзень донара акцыя па бязвыплатным донарстве прайшла побач з будынкам Міністэрства аховы здароўя ў Мінску. Каля сотні чалавек паўдзельнічалі ў ёй на гэтай пляцоўцы. Сярод іх — кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі ўстаноў адукацыі і спорту, грамадскіх аб'яднанняў.**

Штодзень у медыцынскіх стацыянарах краіны праходзіць да тысячы пераліванняў крыві. А донарамі штогод становяцца 100 тысяч чалавек. Каля 40 арганізацый службы крыві ва ўсіх рэгіёнах кожны дзень нарыхтоўваюць кроў. Дзякуючы гэтаму многіх людзей удаецца пазбавіць ад цяжкіх захворванняў і нават выратаваць жыцці.



Пляцоўка, дзе арганізавалі спецыяльны мабільны пункт, — гэта станцыя на колах, абсталяваная камфортнымі крэсламі, апаратурай для забору крыві, халадзільнікамі для яе захоўвання. Тут працуе выязная брыгада спецыялістаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. Патэнцыяльныя донары праходзяць абследаванне, пасля чаго атрымліваюць допуск да данацыі. Адным з першых далучыўся да акцыі **намеснік міністра аховы здароўя Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ.**

— Тое, што дзень донара прыпадае на адзін тыдзень з Днём медыцынскага работніка, сведчыць пра важнасць донарства. Многія медыцынскія работнікі ўдзельнічаюць у здачы крыві. Служба крыві ў нашай краіне развіваецца з моманту станаўлення аховы здароўя. Донарская кроў выкарыстоўвалася падчас войнаў, іншых катаклізмаў для вялікай колькасці пацыентаў, і актуальнасць гэтага не страчана сёння. Цяпер найбольшая колькасць крыві расходуецца на людзей, якія маюць патрэбу ў экстранным аказанні медыцынскай дапамогі, — расказаў намеснік міністра.

Аляксандр Старавойтаў адзначыў, што ў нашай краіне за год нарыхтоўваецца амаль 300 тысяч тон кампанентаў крыві. З яе вырабляюцца прэпараты, неабходныя для пералівання. Кожны дзень 500—1000 пацыентам пераліваюцца кампаненты крыві. Штогод у Беларусі павялічваецца колькасць донараў. Паводле рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, донарства павінна быць бязвыплатным.

— У Міжнародны дзень донара мы разам з сістэмай аховы здароўя папулярызуем донарства. Яно вельмі важнае, асабліва бязвыплатнае. Менавіта бязвыплатнасць, гуманнасць мы ўкладваем у паняцце донарства. Штогод у гэты дзень каля тысячы чалавек у краіне ахвотна прыходзяць, каб бясплатна здаць кроў, — адзначыў **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ.**



Да акцыі таксама далучыліся першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый Кійко, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый Кавалькоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый Баскаў, старшыня Мінгарсавета Арцём Цуран, дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар Карпенка, прадстаўнікі партыі «Белая Русь» і іншыя.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота прэс-службы Міністэрства аховы здароўя.**

Варта ўбачыць

# У паходна-палявых умовах, у акупацыі, у палоне

## Подзвіг ваенных медыкаў і фармацэўтаў у гады вайны адлюстроўвае выстава Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея

**Пра цяжкую работу медыкаў на вайне мы ведаем найбольш з кніг і фільмаў. Як рызыкавалі жыццём, ратуючы параненых, як самі гінулі ад куль і снарадаў... Не меншай, а можа, і большай пашаны заслугоўваюць тыя, хто працаваў ва ўмовах акупацыі, дапамагаў партызанам і падпольшчыкам медыкаментамі, лячэннем, рызыкуючы ўжо не толькі сваім жыццём, але і нават існаваннем сваёй сям'і. Менавіта ім, людзям самай гуманнай прафесіі, медыкам і фармацэўтам на вайне, прысвечаная выстава ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.**





Творчая група выставы за афармленнем інсталяцыі «Партызанскі шпіталь».

**Куратар выставы загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела Ніна КІРЫЛАВА** гаворыць, што экспазіцыю такога роду ў музеі рыхтавалі ўпершыню і, як пазней высветлілася, не толькі ў брэсцкім музеі. Таму было адначасова і цікава, і надзвычай складана. А ідэю зрабіць такую выставу падала супрацоўнік РУП «Белфармацыя» Валянціна Сасонкіна. Як слушна заўважыла Валянціна Фёдараўна, часта наяўнасць альбо адсутнасць лякарства ва ўмовах вайны вырашалі пытанне жыцця. Пра фармацэўтаў жа наогул гаварылі ў гэтым кантэксце рэдка.



Доктар Уладзімір Каробка.

Сапраўды, многія памятаюць прозвішча брэсцкай падпольшчыцы-камсамолкі Галіны Аржанавай. Яна была закатавана фашыстамі ў Брэсцкай турме ў 1942 годзе, а да гэтага фармацэўт адправіла дзясяткі, а то і сотні пасылак з лякарствамі ў партызанскія атрады, як потым падлічылі, кошт медыкаментаў склаў каля 40 тысяч рублёў. Адважная дзяўчына трымала сувязь і з падполлем, і з партызанамі. На выставе яе здымак размешчаны побач са здымкам і перапіскай музейных работнікаў з бацькам Галіны. Яго кранальныя пісьмы цяжка чытаць без слёз. На просьбу перадаць рэчы дачкі Аляксандр Міхайлавіч напісаў, што зрабіць гэта немагчыма, бо дом іх быў разбураны, нічога не засталося. А яшчэ бацька піша, як і праз 20 гадоў не можа змірыцца са стратай любімай дачушкі.

А вось яшчэ лёс: хірург з Пружан Уладзімір Каробка, бліскуча адукаваны, мужны, адданы прафесіі чалавек. У экспазіцыі прадстаўлены яго кнігі, здымкі, медыцынскія інструменты. Уладзімір Каробка нарадзіўся ў вёсцы Вялікія Якавічы пад Пружанамі. Пасля заканчэння Пружанскай гімназіі паступіў у Віленскі ўніверсітэт, адкуль у 1939 годзе быў пераведзены ў Львоўскі інстытут. Там атрымаў дыплом урача-хірурга акурат у чэрвені 1941 года. Пасля акупацыі Львова стаў дабірацца дадому. Шлях заняў ажно два тыдні. У Пружанах ужо былі немцы, акупацыйныя ўлады накіравалі маладога ўрача на работу ў бальніцу. У хуткім часе Уладзімір стаў галоўным урачом.

У бальніцы лячыліся і акупанты, і мясцовыя жыхары. З урачом адразу звязаліся падпольшчыкі. Уладзімір Ігнатавіч прымаў на лячэнне нават партызан, вядома, пад чужымі прозвішчамі і па чужых дакументах. У 1944 годзе пасля вызвалення бальніца стала шпіталем, дзе хірург Каробка ратаваў жыцці параненых байцоў Чырвонай Арміі. Але ж пасля вайны Каробку арыштавалі, і толькі намаганнямі былых партызан, ім выратаваных, удалося дабіцца яго вызвалення ў 1946 годзе. Пасля гэтага доктар адразу выехаў за мяжу і працаваў у Польшчы да апошняга дня жыцця. Памёр Уладзімір Каробка ў 1977 годзе.





Уладкаваць раздзел пра хірурга Каробку дапамаглі супрацоўнікі музея-сядзібы «Пружанскі палацык». У іх сабраны багаты матэрыял пра земляка-медыка, а на Пружаншчыне жывуць сваякі таленавітага хірурга.

Дарэчы, стварэнню выставы паспрыялі акрамя названага музея мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», РУП «Белфармацыя» і Брэсцкае РУП «Фармацыя», Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, а таксама краязнаўцы, нераўнадушныя брастаўчане.

Ніну Кірылаву, кіраўніка творчай групы па падрыхтоўцы выставы, у працэсе работы чакала шмат адкрыццяў. Пра тэму работы абмовілася ў гутарцы са знаёмым урачом Людмілай Пабядзінскай. А тая расказала, што яе маці ў вайну таксама была франтавым урачом. Маці яе, Кацярына Мацвеенка, — выпускніца Кіеўскага медінстытута 1941 года, пасля кароткіх курсаў ваенурача адразу атрымала накіраванне на фронт. Людміла Віктараўна згадала расповед маці, як аднойчы яна аперыравала зусім побач з ліній фронту. І калі паблізу рваліся снарады, аперацыйная сястра з яе дазволу хавалася пад сталом, а яна, хірург, стаяла над пацыентам і фактычна закрывала яго сваім целам. Вось у такіх умовах нярэдка працавалі медыкі.

Адкрыццяў было шмат. Напрыклад, яшчэ пры падрыхтоўцы асноўнай гістарычнай экспазіцыі музея Ніна Кірылава аднойчы апісвала невялічкую кнігу з бібліятэкі Сапег. Былі звесткі, што кнігу ў свой час перадаў музею святар з Ружан Іаан Наўроцкі. Ніна Міхайлаўна прызналася, што заўсёды хацела даведацца пра гэтага чалавека больш, усведамляючы яго культурна-адукацыйны ўзровень, грамадзянскую пазіцыю: «Уяўляеце, у пачатку пяцідзясятых гадоў, калі і дабрацца з Ружан у Брэст было даволі складана, ён прыязджае сюды і перадае музею кнігу з бібліятэкі Сапегаў, якая захоўвалася столькі часу ў сям'і». І вось куратар выставы пры яе падрыхтоўцы сустрэлася са звесткамі пра святара Наўроцкага ў кантэксце дапамогі савецкім ваеннапалонным. Менавіта айцец Іаан даў прытулак параненым на тэрыторыі Свята-Петра-Паўлаўскага храма, а ўрач Віктар Лякомцаў іх там лячыў. Можна сабе ўявіць, як абодва рызыкавалі. Партрэт святара цяпер у цэнтры аднаго з раздзелаў выставы.

Экспазіцыя вельмі інфармацыйна насычаная. Тут можна даведацца, як была арганізавана медыцынская дапамога на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, як самааддана працаваў кіраўнік ваеннага шпіталя крэпасці Барыс Маслаў, якому аддалі заслужаную пашану толькі праз многія дзесяцігоддзі. (Нядаўна ў Брэсце адна з вуліц названа ў гонар ваенурача. — **Аўт.**).

Несумненна, цікава будзе прачытаць альбо пачуць ад экскурсавода, як арганізоўвалася медыцынская дапамога ў партызанскіх атрадах. Напрыклад, Пінскае партызанскае злучэнне абслугоўвалі 16 дактароў, 32 фельчары, 10 медсясцёр, тры зубныя ўрачы, 27 санітараў і 20 санінструктараў. А начальнікам медслужбы злучэння быў доктар Мікалай Вітаравіч. Вайну Мікалай Іванавіч сустрэў камандзірам медсанбата адной з часцей у Брэсце. Потым былі палон, уцёкі, недавер, праверкі, але ўсё перажыў, і толькі ва ўмовах партызанскіх шпіталяў правёў больш за 100 аперацый. Ёсць здымкі, якія адлюстроўваюць работу партызанскага шпіталя ў вёсцы Сварынь Драгічынскага раёна.

На падставе дакументаў паказана, як працавала адзіная бальніца ў Брэсцкім гета, дзе на невялікай тэрыторыі размясцілася адразу 18 тысяч чалавек. Пра гета расказвае асобны раздзел выставы. Ёсць дакументы і здымкі-сведчанні таго, як ратавалі байцоў у палоне такія ж палонныя ўрачы. Усяго экспазіцыя налічвае больш за 200 прадметаў. Тут ёсць партызанская аптэчка, сумка санінструктара, ампулы і бутэлечкі ад лекаў таго часу, шмат сапраўднага медыцынскага інструментарыю. Выставу дапаўняе інсталяцыя «Партызанскі шпіталь», жывапісныя і графічныя работы мастакоў Івана Рудчыка, Пятра Дурчына. Работнікі РУП «Фармацыя» таксама вырабілі халаты па ўзоры формы медыкаў таго часу.

Выстава пад назвай «Яны дарылі жыццё ў баі» ўвесь час запатрабаваная. Аўтар гэтых радкоў, калі наведала яе 11 чэрвеня, заспела экскурсію для студэнтаў-гісторыкаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і вучняў 12-й школы. Цікава, што першапачаткова было заяўлена правядзенне выставы да 14 ліпеня гэтага года. Але галіновы прафсаюз медыцынскіх работнікаў выступіў з хадайніцтвам працягнуць работу, каб атрымаць магчымасць пазнаёміцца з ёй удзельнікам вялікай нарады, якая адбудзецца ў Брэсце ў жніўні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота аўтара і краязнаўчага музея.**

# ЗА СЯБЕ І ЗА ТАГО ХЛОПЦА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Яшчэ шасці гадоў мне не споўнілася, як пачалася Вялікая Айчынная вайна, — успамінае Аляксей Сідаравіч. — І вось тры гады лесу, партызанскіх зямлянак. Голад... Холад... Пабегаў я ад гэтых праклятых... Мой дзядзька быў доктарам. Яго і шасцярых дзяцей, жонку, цесця з цешчай немцы забілі — кінулі жыўцом у калодзеж, а хату спалілі... Калі бацька вярнуўся з фронту, ён сказаў мне: «Дзядзька Васіль загінуў, ты павінен працягнуць яго справу. Ты добра вучышся, павінен стаць доктарам».

Аляксей Сідаравіч скончыў сем класаў вясковай школы. «Я вучыўся выдатна. Паступіў у Баранавіцкае медыцынскае вучылішча. Пасля заканчэння мяне адправілі працаваць у бальніцу вёскі Палачаны Маладзечанскага раёна. Пазней працаваў урачом у Антопальскім дзіцячым доме. І я так любіў займацца з дзецьмі! І яны мяне вельмі любілі, заўсёды чакалі, калі я вярнуся. Тут я сустрэў сваю другую палавінку Раю. Яна круглая сірата. Вайна загубіла і яе дзяцінства. Бацьку і маці немцы расстралялі ў двары ўласнага дома. Суседка схапіла дзяўчынку за руку і ўцякла з ёй...» — распавядае суразмоўца.

Праз год пасля сустрэчы маладыя людзі пажаніліся. «Рая вучылася завочна ў педінстытуце Горкага (цяперашні БДПУ імя М. Танка). Калі скончыла вучобу, сказала, што прыйшла пара і мне вучыцца: «Ты ж такі таленавіты, кемлівы! У цябе абавязкова ўсё атрымаецца!» Я ўсяляк дапамагаў ёй з вучобай. На той момант у нас ужо было двое дзяцей — Сяромка ды Іра. А жыць не было дзе. Бацька мой быў вельмі рукасты. Я пераняў у яго гэтыя навыкі і за год сваімі рукамі пабудаваў дом. Мы як селі на падлогу, усёй сям'ёй плакалі ад радасці, што нарэшце ў сваім доме», — расказвае Аляксей Сідаравіч.

Жонка ўсё ж настаяла, каб ён вучыўся далей, і ў 1963 годзе наш герой пайшоў здаваць экзамены для паступлення ў Мінскі медінстытут. «Калі паступіў у інстытут, абышоў усе 52 кафедры. На 50 я атрымаў пяцёркі, на дзвюх — чацвёркі. Першую і другую сесію здаў на выдатна. Тады я стаў Ленінскім стыпендыятам. У гэты час паралельна працаваў фельчарам на хуткай дапамозе ў Заслаўскай бальніцы. Было складана сумяшчаць, я ўжо збіраўся звальняцца, але папрасілі яшчэ адзін дзень падзяжурыць, бо не было каму. І вось так адзін дзень дзяжурства ператварыўся ў шэсць гадоў. І на працы спраўляўся, і ў інстытуце вучыўся, і ўсё паспяваў. Скончыў інстытут паспяхова, мяне запрашалі пасля і ў аспірантуру, але трэба было падымаць дзяцей...»

Пасля заканчэння медінстытута Аляксея Сідаравіча размеркавалі ў Заслаўскую бальніцу — туды, дзе працаваў фельчарам. І адразу прызначылі на адказную пасаду — намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай рабоце. А праз некалькі месяцаў і ўвогуле галоўным урачом.

У 1980 годзе Аляксею Хомчыку прапанавалі ўзначаліць новы санаторый. «Хацеў назваць яго «Райскі куточак», але міністр прыняў назву «Сасновы бор». «Дарэчы, я спадабаўся міністру таму, што ў адрозненне ад іншых адразу спытаў: «А калі прыступаць?» — згадвае Аляксей Сідаравіч. — Ён мне давяраў, разам з ім усё будавалі, праектавалі. Час патрабаваў раскошы, а ў нас былі толькі голыя сцены. Тады мы пабудавалі гідрапарк, лячэбна-дыягнастычны корпус, басейн, а затым — люксавы корпус з трохпакаёвымі нумарамі. У гідрапарку я высадзіў дрэвы, пабудаваў альтанкі, праклаў дарожкі, запусціў рыбу ў вадаём. Правёў і асфальтавую дарогу да санаторыя, запусціў аўтобусы. Спачатку гэта быў санаторый-прафілакторый на 300 месцаў. Але я пераканаў міністра прыбраць прыстаўку «прафілакторый» і зрабіць яго даступным не толькі для меліяратараў, але і для ўсіх ахвотных». Пасля чарнобыльскай трагедыі санаторый быў перапрафіляваны. У ім пэўны час аздараўляліся сем'і чарнобыльцаў. Калі ж з'явілася магчымасць прымаць усіх, сюды масава пачалі прыязджаць з далёкага і блізкага замежжа.











На ўездзе ў санаторый цяпер ляжыць валун, на якім напісана дата заснавання ўстановы. Камень Аляксей Сідаравіч убачыў у полі. «Мы яго адшліфавалі, надпіс зрабілі. Шыльду хто-небудзь можа збіць, кінуць, а гэтую глыбу ўжо ніхто не зрушыць — валун аб'ёмам 12 метраў кубічных важыць 29 тон», — тлумачыць ён, чым кіраваўся пры стварэнні інсталяцыі.

Галоўным урачом у санаторыі «Сасновы бор» наш герой працаваў 25 гадоў. На пенсію пайшоў у 2005-м, калі было ўжо больш за 70. А сваё жаданне назваць санаторый «Райскі куточак» ён увасобіў у верш, які стаў гімнам установы.

Па словах Аляксея Сідаравіча, 25 гадоў праляцелі як адно імгненне. Кожны дзень у працы. Санаторый неаднаразова станавіўся пераможцам рэспубліканскіх спаборніцтваў. У 1994 годзе яго нязменнаму ад заснавання кіраўніку прысвоілі званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь».

Сёння наш суразмоўца, нягледзячы на паважаны ўзрост, не страчвае цікавасці да жыцця і бадзёрасці. Піша вершы — у гэтым знаходзіць задавальненне і спакой. Шмат увагі ўдзяляе сваёй сям'і. «Сын захацеў быць гісторыкам. Мая жонка Рая таксама была настаўніцай. Таму я быў не супраць. Дачцэ ж я прапанаваў прадоўжыць нашу дынастыю. Яна пасля заканчэння медінстытута доўгі час працавала ў Заслаўі. Іра раней актыўна займалася горным турызмам — была ўрачом каманды. Сёння яна ўжо на пенсіі, але ўсё яшчэ працуе. Яна працягнула нашу справу ўжо ў трэцім пакаленні, а гэта вельмі важна».

«У свой час бацька скончыў курсы іголкатэрапіі, — уступае ў размову Сяргей Аляксеевіч. — Займаўся ўсходнімі методыкамі лячэння — іголкаўколваннем і рэфлексатэрапіяй. Быў добрым пчаляром, сталяром — у свой час рабіў платы, аконныя рамы, дзверы, табурэткі, дошкі для разроблівання мяса і нават вуллі. Увесь паркет у хаце выразаў сам... А яшчэ захапляецца вязаннем. Кажа нам, маладзейшым, што самае галоўнае правіла даўгалецця — пастаянная трэніроўка мозгу. Ён заўсёды ў курсе апошніх навін, цікавіцца палітыкай, геаграфіяй, спортам, рашае красворды, чытае мастацкую літаратуру. Бацька кажа, што чытаць трэба кожны дзень, прычым старонак дзесяць услых, таму што з-за ўзросту пачынае заплятацца язык. «Ганна Карэніна», «Браты Карамазавы», творчасць Сяргея Ясеніна — аддае перавагу класічнай літаратуры».

«Бацька заўсёды меў добрую рэпутацыю ў людзей, — з гонарам гаворыць сын. — Найлепшы крытэрый гэтага — сувязь нават пасля сыходу з працы. А нашага Аляксея Сідаравіча многія людзі дагэтуль успамінаюць з удзячнасцю...»

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**

**Фота Лізаветы ГОЛАД,**

*Радашковічы.*